**Літаратура**

1. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2012. – Ч. 1. – 304 с.
2. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / А.С. Дзядова (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2014. – Ч. 2. – 358 с.
3. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / Ю.Ф. Мацкевіч (рэд.) [і інш.].– Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – Т. 2.–728 с.
4. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / Ю. Ф. Мацкевіч (рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – Т. 4. – 616 с.

**К.А. Зайцава** (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

# НАМІНАТЫЎНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ Ў РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІДРАНІМІІ

***Ключавыя словы:*** гідронім, рэгіёнім, тапанімія, намінацыя, апелятыў.

Гідронімы, з'яўляючыся адным з архаічных класаў тапаніміі, уяўляюць сабой каштоўную крыніцу інфармацыі пра гісторыю, побыт, ментальнасць народа. Гідронімы, што "прадстаўляюць адну з прыродных стыхій, трывала ўвайшлі ў культуру розных народаў, у тым ліку і славянскіх. Аграрная і бытавая магія старажытных славян была заснавана на шанаванні вады, зямлі і сонца як асновы жыцця чалавека. Рэліктамі старажытных міфалагічных уяўленняў пра ўпарадкаванне свету і яго асноўныя духоўныя сілы з'яўляецца вера ў ачышчальную, цудатворную сілу вады, адкуль вада з'яўлялася і з'яўляецца неад'емнай часткай многіх іншых рытуалаў" [1, с. 55]. Актуальнасць даследавання гідранімнай лексікі прадыктавана наяўнасцю вялікай колькасці даследаванняў мовазнаўцамі (Т.М. Багаедава, Н.А. Багамольнікава, В.А. Жучкевіч, Р.М. Казлова, І.Л. Капылоў, А.І. Копач, В.П. Лемцюгова, Г.М. Мезенка, М.У. Міцкевіч, А.Ф. Рогалеў, Т.І. Сінкевіч, В.А. Шклярык, Н.Р. Якубук і інш.).

У дадзенай працы намі зроблена спроба вызначыць намінатыўныя прыярытэты ў гідраніміі Бешанковіцкага рэгіёна, які з'яўляецца часткай Беларускага Паўазер'я, які амываецца галоўнай воднай артэрыяй Усходняй Еўропы – ракой Заходняя Дзвіна (старажытныя назвы *Бубон, Рубон, Рудон, Судон, Хесін, Эрыдан*). Згодна В.А. Жучкевічу, гідронім Дзвіна мае фінскае паходжанне са значэннем "ціхая, павольная" [2, с. 92–93].

Працэс намінацыі водных аб'ектаў часцей за ўсё адбываўся шляхам выдзялення ў кожнага з іх асаблівых другасных прыкмет (форма, памер, глыбіня, колер і інш.). Паводле характару і семантыкі ўтваральных асноў гідранімны інвентар Бешанковіччыны ўключае ў свой склад намінацыі апелятыўнага і анамастычнага паходжання. У сувязі з гэтым сярод усіх афіцыйных назваў водных аб'ектаў намі былі вылучаны наступныя прынцыпы намінацыі:

- ❖ прынцып намінацыі аб’екта па адносінах да онімаў;
- ❖ прынцып намінацыі аб’екта па адносінах ад апелятываў.

Першую групу найменняў прадстаўляюць адзінкі, утвораныя ад **онімаў** (43%). Пераважная большасць іх узыходзіць да:

1) камонімаў. Адной з семантычных асаблівасцей гідронімаў з’яўляецца намінацыя аб’екта па назве сельскага населенага пункта, дзе размешчана возера (часцей за ўсё), балота, рака. У дадзеную групу намі ўключаны наступныя назвы: *воз. Астровенскае, р. Астраўніца, воз. Астроўна* – ад агр. Астроўна, *воз. Гаро́дна* – ад в. Гародна, *воз. Дыбалёўскае* – ад в. Дыбалі, *воз. Заазе́р’е* – ад в. Заазер’е, *воз. Забе́льскае* – ад в. Забелле, *воз.Запо́льскае* – ад в. Запо́лле, *р.Кры'вінка* – ад в. Кры'віна, *воз. Нізгалаўе* – ад в. Двор Нізгалава, *воз. Слабадско́е* – в. Слабада́, *р. Чарнаго́сніца* – ад в. Чарнаго́сце, *р. Хо́цінка* – ад в. Хо́ціна, *воз. Хо́цінскае* – ад в. Хоціна. Большасць назваў рэк і азёр утварылася такім спосабам. Ёсць і адваротныя выпадкі, калі першаснай з’яўляецца аснова воднага аб’екта. Вядома, што першыя пасяленні людзей з’яўляліся на берагах рэк, імёны якіх нярэдка станавіліся найменнямі пасяленняў. У Бешанковіцкім раёне такія выпадкі таксама зафіксаваны. Рака *Ула* дала сваю назву пасёлку, які ўпершыню ўпамінаецца ў XVI стагоддзі, а гэта значыць пазней, чым рака. Горад Чашнікі, які быў заснаваны на гэтай рацэ, ўзгадваецца пад 1504 годам. Гэта гаворыць пра тое, што ў той час рака Ула ўжо існавала. Можна меркаваць, што населены пункт Ула атрымаў назву ад ракі Ула. З’ява трансанімізацыі адбываецца і ў адваротным парадку, калі назва населенага пункта атрымлівае назву ад воднага аб’екта: *вёска Паўазер’е ← возера Паўазер’е.*

2) антрапонімаў. Дадзены тып намінацыі прадстаўляе толькі адзін аб’ект – *возера Антошава,* што ўзыходзіць да дэмінутыўнай формы ўласнага імя Антон. Невялікая наяўнасць гідронімаў такога тыпу з’яўляецца адным з адрозненняў гідраніміі Бешанковіцкага раёна ад іншых рэгіёнаў.

3) патамонімаў**:** *р. Бярозка* (рака атрымала назву ад возера Бярозаўскае, адкуль бярэ свой пачатак )**.**

Другую тэматычную групу гідронімаў, што ўзыходзяць да **апелятываў** (54%), утвараюць назвы, якія ў сваю чаргу абазначаюць:

– <u>памер, форму, фізічныя асаблівасці аб’екта</u>: *воз. Глыбокае* (в. Малы Двор), *воз. Доўгае* (агр. Астроўна), *воз. Круглае* (в. Чарнагосніца), *воз. Мелкае/воз. Малае* (в. Замялочча), *в. Паўазер’е* (В.А. Жучкевіч суадносіць гэты гідронім з назвай-характарыстыкай, дадзенай па форме азёрнай катлавіны [2, с. 301];

– <u>колер аб’екта:</u> *воз. Белае* (г.п. Бешанковічы, в. Гарадзец, в. Пушкары), *воз. Саро* (в. Сініцы, назва *Саро* – аднаго з самых глыбокіх азёраў на тэрыторыі Беларусі – паходзіць ад балтыйскай асновы sartos – буры, рыжы), *воз. Чарніца* (б.р. Чарнічанка), *воз. Чорнае* (в. Свяча). Гідронімы Белае і Чорнае возера надта распаўсюджаны на тэрыторыі Беларускага Паўазер’я (*Белых* азёр налічваецца каля 14, *Чорных* – 12 адзінак, акрамя таго,

аснова *чорн-* прысутнічае ў назвах рэк і балот – каля 16 намінацый).У сувязі з язычніцкімі традыцыямі белы колер лічыўся сімвалам станоўчага, чыстага пачатку, сімвалам шчасця. У сучаснай свядомасці людзей белы колер асацыіруецца з чысцінёй і святасцю. Чорны колер, наадварот, лічыцца колерам нячыстай сілы. Так, у агр. Свяча існуе паданне пра *возера Чорнае*, як пра заклятае месца, у якім нават не водзіцца жыўнасць. Таксама намінацыі з матывавальнай асновай *чорн-* суадносяцца з месцазнаходжаннем геаграфічнага аб'екта адносна тарфянікаў (*Чорны ручай*);

– адзінкі фітафорнай лексікі: *воз. Вербнае (в. Фролкавічы)* матывавальная аснова якога, на нашу думку, суадносіцца з раслінай вярба, якой параслі берагі возера .

– рэлігійныя паняцці: *воз.Святое* (г.п. Бешанковічы);

– рэчывы: *рака.Ула*, назва якой паходзіць ад балтыйскага кораня ohla, ohlis – 'галька, дробныя каменьчыкі' [2, с. 384].

Такім чынам, галоўнымі прыярытэтамі іменавання водных аб'ектаў на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна з'яўляюцца іменаванне аб'екта па яго адносінах да онімнай і апелятыўнай лексікі. Самымі распаўсюджанымі з'яўляюцца намінацыі, якія характарызуюць аб'ект па памерах, канфігурацыі. Яркай прыкметай гідраніміі з'яўляецца працэс трансанімізацыі. Зыходзячы з таго, што гідронімы з'яўляюцца самым старажытным і нязменным сектарам тапаніміі, то даследаваныя адзінкі можна ўспрымаць як каштоўную крыніцу інфармацыі пра асаблівасці ландшафту Бешанковіцкага краю.

*Спіс скарачэнняў:*

*агр. – аграгарадок, в. – вёска, б.р. – басейн ракі, воз. – возера, г.п. – гарадскі пасёлак.*

**Літаратура**

1. Белорусская ономастика. Топонимия: учеб. пособие / А.М. Мезенко [и др.]; под общ. ред. А.М. Мезенко – Минск: Элайда, 2012. – 260 с.
2. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А. Жучкевич. – Мн., 1974. – 448 с.

**Т.А. Кісель, А.П. Чалюк** (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)

## НАЗВЫ ТРАВЯНІСТЫХ РАСЛІН У ГАВОРЦЫ ВЁСКІ ПЯШЧАНКА БЯРОЗАЎСКАГА РАЁНА

***Ключавыя словы:*** дыялектная мова, батанічны номен, травяністыя расліны, батанічная наменклатура.

Бярозаўшчына – край цудоўнай прыроды. Лугі, рэкі, азёры, балоты, лясы складаюць прыродныя рэсурсы раёна (азёры Спораўскае, Белае, рака Ясельда і інш.). Сустракаюцца і ўнікальныя балотныя і лясныя ландшафты, што захаваліся некранутымі часам. Іх можна ўбачыць у Рэспубліканскім